А. С. Майхровіч.
Дырэктар інстытута філасофіі і права
НАН Беларусі
доктар філасофскіх навук

## Аб тэндэнцыях сучаснага грамадска-палітычнага развіцця Беларусі

Пачатак 90-х гадоў адзначаны ўступленнем Беларусі ў стадыю няўстойлівага існавання. Яна характарызуецца наяўнасцю яшчэ дастаткова трывалых таталітарных структур, вельмі запаволеным працэсам іх распаду і кволасцю, непаслядоўнасцю тэндэнцый дэмакратычных пераўтварэнняў.

Тым не менш, падзеі пачатку 90-х гадоу і абвяшчэнне Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці заклалі аснову кардынальных перамен у грамадскім жыцці і нацыянальнай свядомасці. Гэтыя перамены дастаткова выразна выявіліся ў разняволянні грамадскай думкі ад былой ідэалагічнай залежнасці, адыходзе ад звыклай падначаленасці знешняму ўціску, дэмакратызацыі дзяржаўна-палітычнай і законадаўча-прававой сфер. Пачаў афармляцца новы, шматпартыйны спектр палітычнага жыцця. Прыпыненыя на працягу шэрагу дзесяцігоддзяў працэсы нацыянальнага самавызначэння беларусаў атрымалі імпульсы да свайго адраджэння і развіцця.

Аднак у Беларусі гэтыя працэсы адбываюцца спантанна, пад уплывам агульнай постсацыялістычнай атмасферы і асобных органаў масавай інфармацыі. Таксама патрэбы і інтарэсы нацыянальнага і культурнага самавызначэння і развіцця Беларусі на дэмакратычнай аснове, спрыяльнай сінтэзу духоўных дасягненняў розных народаў, не сталі пакуль яшчэ прынцыпам усеагульнай палітыкі.

Працэс пашырэння дэмакратычных каштоўнасцей у грамадстве, унутранае аблічча якога на працягу дзесяцігоддзяў складвалася пад моцным удзеяннем універсаліцкай дактрыны, што цалкам падпарадкоўвала чалавека вышэйшым дзяржаўна-ідэалагічным мэтам, не можа быць хуткім і кардынальным.

Дарэчы адзначыць, што падуладнасць уплыву наяўнай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, асаблівая адчувальнасць да ціску навакольных абставін, як і адвольныя утапічныя спадзяванні і пабудовы, багата замешаныя на

абстрактных ідэях усеагульнай справядлівасці, - характэрныя рысы нацыянальнай свядомасці і светапогляду, яскрава зафіксаваныя новай беларускай культурай XIX - пач. XX ст. Ды і ўвогуле канкрэтны ўтылітарызм падыходу да свету, у тым ліку да з'яў і падзей сацыяльнага жыцця, у спалучэнні з абстрактным утапізмам з'яўляецца тыповай выявай светаадчування прадстаўнікоў «сялянскай нацыі», якая сфарміравалася яшчэ ў мінуўшчыне. Адметным жа адбіткам нашага стагоддзя стала пераўзыходзячая ўсякія межы падатлівасць большасці грамадства на любыя ўдзеянні ўладных структур.

Таму пры наяўнасці такой спадчыны натуральным з'яўляецца захаванне тэндэнцыі да падначалення грамадства дзяржаве, монаідэалагізацыі грамадскай свядомасці, узнаўлення патэрналісцкіх чаканняў. У гэтым жа шэрагу - нівеліроўка індывіда, падтрымка прэстыжнасці каштоўнасцей улады і сілы, а таксама гіпертрафіраванага ўяўлення пра ролю вышэйшага аўтарытэту.

У гэтых умовах асноўныя намаганні павінны быць накіраваны на хутчэйшае духоўна-гуманістычнае абнаўленне грамадства на глебе выпрабаваных часам агульначалавечых каштоўнасцей - дэмакратыі, незалежнасці, правоў асобы, народнага дабрабыту. Аднак замест гэтага вельмі часта назіраюцца спробы стараннай эксплуатацыі старых сацыяльна-псіхалагічных стэрэатыпаў, прагматычнага выкарыстання іх прадстаўнікамі асобных сацыяльна-палітычных сіл у сваіх вузкаэгаістычных інтарэсах.

Такая агульная сітуацыя нараджае унутраную супярэчлівасць, дваістасць нацыянальнай грамадскай свядомасці, выразнае афармленне ў ёй супрацьлеглых вартасна-ідэалагічных установак па лініі таталітарызм-дэмакратыя. Гэтая дваістасць грамадскай свядомасці і псіхалогіі ўласцівая ўсім посттаталітарным грамадствам. Спецыфіка ідэалагічных і палітычных настрояў у Беларусі характэрызуецца абцяжарваннем і паглыбленнем гэтай супярэчлівасці іншымі, якія склаліся гістарычна.

Гістарычна ўсталяваная ў Беларусі духоуна-культурная і грамадска-палітычная сітуацыя абумоўлена геапалітычным становішчам краіны, яе адкрытасцю як захаду, так і ўсходу Еўропы. На працягу стагоддзяў Беларусь была рэгіёнам сустрэчы і супрацьборства розных палітычных і культурных уплываў. Наяўнасць і супрацьборства моцных усходніх і заходніх уплываў

перашкаджала развіццю беларускай нацыі, яе самасвядомасці і культуры. Гэта прыводзіла таксама да афармлення двайстасці, двухполюснасці арыентацыі нацыянальнай свядомасці па накірунку усход-захад, што можа быць патэнцыяльнай асновай ідэолага-палітычнай канфліктнасці.

У адным шэрагу адзначанымі двума важнейшымі сацыяльнымі і ідэалагічнымі супярэчнасцямі стаіць трэцяя. Гэта супярэчнасць нацыянальная і духоўна-культурная. Яе сутнасць і драматычны сэнс заключаецца ў тым, што культура і мова народа, які існуе на сваёй спрадвечнай этнічнай тэрыторыі, зведзены да другараднага, маргінальнага элемента грамадска-культурнага жыцця. Аднак краіна не можа існаваць без уласнай культуры. І ў гэтым плане нацыянальна-культурная кансалідацыя і развіццё Беларусі ёсць важнейшая фундаментальная прадумова абнаўлення і прагрэсу ва ўсіх сферах грамадскага жыцця краіны, самаго ее існавання як незалежнай дэмакратычнай дзяржавы.

Зараз у нашым грамадстве існуюць як сілы, патрэбы і магчымасці для вырашэння існуючых праблем на карысць сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага і дзяржаўна-палітычнага прагрэсу, так і процілеглыя ім палітычныя сілы і імкненні, прыхільныя да заснавання старых форм грамадскага існавання. Прычым, працяглыя эканамічныя цяжкасці разам з доўгім захоўваннем грамадства ў стане неўстойлівасці апошнім часам прывялі да істотнага пашырэння настальгічных настрояў па мінуламу.

Перспектывы грамадскага развіцця Беларусі залежаць ад стабілізацыі і вырашэння адзначаных супярэчнасцей у стваральным дэмакратычным накірунку. Паспяховасць гэтага ў многім абумоўлена пэўнасцю дзяржаўнай палітыкі і выразнасцю ўсведамлення карэнных нацянальных інтэрэсаў. Асабліва значэнне ў сучасных умовах набывае фарміраванне новай грамадскай свядомасці, якая грунтуецца на дэмакратычных каштоўнасцях развітай грамадзянскай супольнасці, фундаментальных вартасцях нацыянальнага жыцця і агульначалавечых маральных нормах, народжаных у рэчышчы хрысціянскай традыцыі.

У шэрагу фактараў прагрэсіўных перамен - такіх, як стварэнне неабходных сацыяльна-эканамічных асноў дэмакратычнага грамадства, ажыццяўлення радыкальных перамен у грамадскай свядомасці, - выключна важнае значэнне мае стварэнне новай дзяржаўна-адміністратыўнай сістэмы кіравання. У

нашых умовах дзяржаўная улада традыцыйна і па сутнасці, будучы найбольш трывалым грамадскім утварэннем, застаецца важнейшым дзейсным сродкам уплыву і ўдзеяння на грамадскія працэсы. І ад таго, якая яна па прызначэнню - сродак прымусу і кансервацыі існуючага ці орган стабільнасці і развіцця грамадства, гарант права і законнасці - залежыць вельмі многае ў нашым сучасным і будучым жыцці.

Пакуль яшчэ ў ва многім дзяржаўна-адміністрацыйныя органы Беларусі застаюцца часткай, рэгіянальным адгалінаваннем былой уладнай сістэмы. Аднак ідэя дэмакратычнай дзяржаўнасці і сама дзяржава Беларусь не могуць ажыццявіцца ні на адноўленым таталітарным фундаменце, ні на абстрактнай і безаблічнай рэгіянальна-эканамічнай аснове. Неабходная прадумова ўнутраннага адзінства дзяржавы і яе існавання наогул - поўная сацыяльна-культурная супольнасць, яе гістарычны лёс, яе духоўныя здабыткі, жыццевыя здольнасці і творчая энергія. Дзяржаўнасць ёсць, такім чынам, неабходная форма і выражэнне важнага этапа гістарычнага жыцця народа, ажыццяўлення яго карэнных сацыяльных і духоўных патрэб.

Таму настойлівай неабходнасцю пераходнага перыяду з'яўляецца кардынальнае рэфармаванне старой уладнай сістэмы. Неабходнае прыняцце і рэалізацыя шэрагу мерапрыемстваў, якія канкрэтна вызначылі б мэты і абавязкі дзяржаўных органаў, уладных структур з пункту погляду паспяховага правядзення дэмакратычных пераўтварэнняў. І перш за ўсе па рэалізацыі патрэбы сцвярджэння і развіцця дзяржаўнасці Беларусі.

Канкрэтнае вызначэнне новых функцый і мэт дзяржавы, а не абвяшчэнне агульных дэкларацый, сведчыла б пра першы крок да падначалення дзяржаўнай улады грамадскім патрэбам, да раўнамернага размеркавання былой гранічнай канцэнтрацыі ўладарных функцый на ўсёй прасторы грамадскай супольнасці, да усталявання прынцыпу прамой адказнасці дзяржаўных органаў і іх кіраўніцтва за свае дзеянні.

Галоўнай задачай па устанаўленню новай сістэмы дзяржаўнай улады павінна стаць пераадоленне манапалізму выканаўчых органаў. Неабходна забяспечыць якаснае ўдасканаленне вышэйшай законадаўчай улады. Дзеянні большасці яе прадстаўнікоў з'яўляюцца, па сутнасці, прамым працягам функцый выканаўча-дзяржаўных структур. Гэта робіць

дэкаратыўнай саму існуючую заканадаўчую сістэму як нібыта прадстаўніча-парламентарыскую.

У гэтых адносінах важнае значэнне мае прынцып фарміравання парламента як органа выключна прафесійнага, калі выключана сумяшчэнне абавязкаў дэпутата з іншымі родамі заняткаў, што непазбежна ператварае парламент у поле перацягвання вузкаэгаістычных патрэб прадстаўнікоў розных галін вытворчасці, выканаўчай улады, грамадскіх супольнасцей, якія імкнуцца сцвердзіць сваё манапольнае становішча ў сучасным палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці.

Неабходна таксама прадугледзіць прадстаўніцтва ў парламенце ўсяго спектру палітычных імкненняў грамадства, каб пазбавіць выканаўчыя органы магчымасці ўзнаўляць свой фактычны уладны манапалізм пад прыкрыццём парламенцкай формы.

І, натуральна, павінны быць прадугледжаны меры па рацыянальнаму пераразмеркаванню ўлады паміж вышэйшымі выканаўчымі ўтварэннямі і органамі мясцовага самакіравання.

Разам з павышэннем статусу заканадаўчай улады асаблівае значэнне ў справе дэмакратызацыі грамадска-палітычнай структуры мае развіццё сістэмы мясцовага самакіравання як органаў «лакальнай», што ідзе знізу, дэмакратыі. Органаў выбраных народам і прызначаных самастойна вырашаць усе пытанні мясцовага жыцця. Пакуль падначалены характар органаў мясцовага кіравання і самакіравання адпавядае агульнай сістэме улады, а між тым грамадская актыўнасць шырокіх пластоў насельніцтва з'яўляецца тым патэнцыяльным творчым рэзервам, без запатрабавання якога краіна будзе аддадзена на волю чыста бюракратычных ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне ўласнага становішча.